ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама
А.Л.Вярсоцкі
2017 г.

Парадак арганізацыі і правядзення абласнога фестывалю народнай музыкі
“ЗАЙГРАЙЦЕ, МУЗЫКІ!”

I. Мэты і задачы.

1. Садзейнічанне мастацкаму развіццю і павышэнню выканальніцкага ўзроўню ансамбляў народнай музыкі і аркестраў народных інструментаў.

2. Павышэнне і ўзбагачэнне рэпертуару калектываў мастацкай творчасці лепшымі ўзорамі народнай музыкі.

3. Папулярызацыя інструментальнай музыкі, развіццё выканальніцкай школы ігры на народных інструментах.

4. Узбагачэнне духоўнага свету насельніцтва здабыткамі народнага песеннага і інструментальнага мастацтва.

5. Фарміраванне эстэтычнага густу маладога пакалення на лепшых узорах нацыянальнай музычнай культурнай спадчыны і сучаснага мастацтва.

II. Арганізатары фестывалю.

Галоўнае ўпраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама.

Аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Лідскага райвыканкама.

ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”.

III. Парадак і ўмовы правядзення фестывалю.

Абласны фестываль народнай музыкі “Зайграйце, музыкі!” праходзіць раз у тры гады ў г.Ліда.

У фестывалі прымаюць удзел лепшыя дарослыя і дзіцячыя аркестры народных інструментаў, ансамблі народнай музыкі і песні, інструментальныя ансамблі (акрамя дуэтаў, трыа) – пераможцы раённых (гарадскіх) тураў, незалежна ад ведамаснай прыналежнасці.

Да ўдзелу ў конкурснай праграме фестывалю калектывы рыхтуюць па 2 творы, адзін з якіх абавязкова беларускага аўтара. Для ансамбляў

народнай музыкі і песні – 2 народныя інструментальныя творы ці 1 народная песня і 1 народны інструментальны твор. Працягласць выступлення – да 6 хвілін.

*Заўвага*! Не дазваляецца выкарыстанне ў складзе калектыву электрагітары, клавішных і іншых электрамузычных інструментаў.

Выступленні канкурсантаў ацэньваюцца па наступных крытэрыях:
- чысціня і выразнасць выканання;
- выканальніцкае майстэрства;
- сцэнічная культура;
- мастацкі ўзровень рэпертуару і якасць апрацоўкі (аранжыроўкі);
- рэжысёрскае і мастацкае афармленне нумару;
- артыстызм, арыгінальнасць выканання;
- выкарыстанне рэгіянальнага матэрыялу, касцюма.

Заяўка (форма дадаецца) ад раёна (горада) на кожны калектыў-удзельнік фестывалю (незалежна ад ведамаснай прыналежнасці) павінна быць зацверджана начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі рай(гар)выканкама.

Афіцыйныя запрашэнні на ўдзел у фестывалі дасылаюцца пасля разгляду аргкамітэтам заявак і папярэдняга (пры неабходнасці) праслухоўвання калектываў ці прагляду відэаматэрыялаў.

IV. Падвядзенне вынікаў фестывалю і заахвочванне пераможцаў.

Па выніках фестывалю журы вызначае лаўрэатаў (I, II, III ступеняў) у наступных намінацыях:
- дарослы аркестр народных інструментаў;
- дзіцячы аркестр народных інструментаў;
- дарослы інструментальны ансамбль (акрамя дуэтаў, трыа);
- дзіцячы інструментальны ансамбль (акрамя дуэтаў, трыа);
- дарослы ансамбль музыкі і песні;
- дзіцячы ансамбль музыкі і песні.

Вызначаюцца ўладальнікі спецыяльных прызоў:
1. глядацкіх сімпатый;
2. за лепшы дэбют;
3. за лепшае рэжысёрскае вырашэнне нумару;
4. за лепшую аранжыроўку песні;
5. за лепшую апрацоўку беларускай народнай мелодыі;
6. за захаванне традыцый беларускай народнай песні;
7. за лепшую інструментоўку (пералажэнне) твора;
8. за дырыжорскае майстэрства.

Усе пераможцы фестывалю – лаўрэаты і ўладальнікі спецыяльных прызоў – узнагароджваюцца дыпломамі ў рамках і прызамі. Астатнія калектывы – дыпломамі "за ўдзел у фестывалі".

Журы пакідае за сабой права аб'ядноўваць, вызначаць дадатковыя намінацыі ў межах выдзеленнага прызавога фонду.

Пераможцы абласнога фестывалю народнай музыкі "Зайграйце, музыкі!" будуць рэкамендаваны для ўдзелу ў абласных мерапрыемствах, рэспубліканскіх і міжнародных фестывалях і конкурсах.

V. Фінансаванне.

Фінансаванне фестывалю ажыццяўляецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: прызы, спецыяльныя прызы, дыпломы, рамкі, праезд, пражыванне, зарабатная плата і налічэнне на зарабатную плату членам журы (2 чал.).

Для фінансавання абласнога фестывалю могуць быць выкарыстаны іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

УВАГА! Арганізатары абласнога фестывалю захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.